**Уладзімір Аляксандраў (г. Мінск, Беларусь)**

# МЕТАКУЛЬТУРЫ Ў ГЛАБАЛІЗАВАНЫМ СВЕЦЕ: ПРАГНОЗЫ ДАНІЛА АНДРЭЕВА

Паэт і мысляр Даніїл Андрэеў застаецца адной з самых загадкавых постацяў XX стагоддзя. Арыштаваны ў разгар сталінскіх рэпрэсій і асуджаны на 25 гадоў зняволення, ён не перапыніў сваю творчасць нават у турме. Галоўны яго твор – «Ружа свету» - прысвечаны асэнсаванню гісторыі чалавецтва з містычнага пункту гледжання. Менавіта таму ён дагэтуль прыцягвае адных і адпалохвае іншых. Але нават крытыкі не могуць адмаўляць беспрэцэдэнтную дакладнасць многіх прагнозаў Д. Андрэева. Зробленыя ў паэтычнай, публіцыстычнай і рэлігійна-прафетычнай формах, яны ахопліваюць найважнейшыя падзеі, працэсы і тэндэнцыі, у тым ліку рубяжа XX-XXI стагоддзяў. Сярод іх: наступленне эры глабалізацыі; параза Савецкага Саюза ў «халоднай вайне» з Захадам; распад як сацыялістычнага лагеру, гэтак і самога СССР; утварэнне канфедэратыўнай структуры ў межах аб’яднанай Еўропы.

Якім чынам Д. Андрэеву ўдалося ў 50-е гады ўбачыць і апісаць тое, што для абсалютнай большасці выглядала неpraўдападобным, што адсутнічала нават у самых смелых футуралагічных творах не толькі публіцыстычнага ці філасофскага, але і мастацкага характару? Сам Д. Андрэеў сцвярджаў, што ключом для ягоных твораў, у тым ліку паэтычных, стала «метагісторыя». Апошнюю ён разумеў у двух значэннях: па-першае, як «сукупнасць працэсаў, што адбываюцца у тых слаях іншабыцця, якія, будучы паглыбленыя ў іншыя плыні часу і ў іншыя віды прасторы, прасвечваюць зрэдчас скрозь працэс, які ўспрымаецца намі як гісторыя» [1, с. 31] і, па-другое, «як вучэнне пра гэтыя працэсы іншабыцця» [1, с. 31]. Далей Д. Андрэеў як містык і візіянер максімальна дакладна апісвае, што і як ён убычыў і зразумеў.

Для мэтаў нашага агляду важным з’яўляецца яго дыялектычны погляд на суадносіны працэсаў глабалізацыі і метакультурнага станаўлення. Мысляр прадбачыў і непазбежнасць, і неабходнасць глабалізацыі, перш за ўсё ў навуковым, тэхналагічным, інфармацыйным, палітычным і прававым абшарах. Але пры гэтым ён сцвярджаў каштоўнасць культурнай разнастайнасці і самабытнасці этнічных, рэлігійных і іншых супольнасцяў. Ядром такой разнастайнасці выступаюць, паводле Д. Андрэева, метакультуры. Пад імі ён разумее буйныя цывілізацыйныя ўтварэнні (і ўсяго пералічвае іх 34, апісваючы з рознай ступеняй падрабязнасці). Часткова гэта карціна супадае з канцэпцыямі прыхільнікаў тэорыі лакальных цывілізацый: М. Данілеўскага, О. Шпенглера, А. Тойнбі. Але хапае і істотных адрозненняў.

Па-першае, метакультуры ў андрэеўскім містычным разуменні ўключаюць не толькі тых людзей, якія жывуць на пэўнай цывілізацыйнай прасторы «тут і цяпер», але і тых, хто працягвае сваё жыццё і творчасць у іншым, пасмяротным быцці, належачы менавіта да пэўнай метакультуры. Так, паводле Д. Андрэева ў стане росквіту ў вышэйшых за наш слаях Зямлі зараз знаходзяцца якраз тыя метакультуры, якія ў нашым слаі ўжо завяршылі сваё існаванне: напрыклад, Старажытнагрэчаская, Егіпецкая, Вавілонская і некаторыя іншыя.

Па-другое, да метакультуры належаць не толькі людзі (уключаючы памерлых ці нават яшчэ не народжаных тут), але і мноства істотаў іншай прыроды. Спіс іх у аўтарскай міфалагічнай карціне свету вельмі шырокі і разнастайны, але тут важна, што ўсе сілы ён падзяляе ў першую чаргу на светлыя і цёмныя, боскія і дэманічныя. Праўда, некаторыя з апошніх на працягу гісторыі і метагісторыі могуць часткова адыгрываць праведынцыяльную місію, так бы мовіць, быць меншым з ліхаў. Напрыклад, так званыя

«дэманы вялікадзяржаўнасці» (у тэрміналогіі аўтара – уіцраоры) на пэўных этапах станаўлення метакультур выступаюць абаронцамі іх матэрыяльнага (фізічнага і трансфізічнага) існавання. У той жа час пры тэрытарыяльнай экспаснсіі іх дзейнасць кіруема цёмным, дэманічным ядром іх існасці.

Але ў стратэгічным, далёкасяжным плане Д. Андрэеў прагназуе такі этап гістарычнага развіцця, калі аб’яднанне светлых сілаў розных метакультур (перш за ўсё іх правадыроў – так званых дэміюргаў народаў і саборных душ) прывядзе да негвалтоўнага аб’яднання народаў на недзяржаўным падмурку. Гэты утапічны пасыл у ягонай канцэпцыі часта падвяргаецца найбольш рэзкай і, у цэлым, справядлівай крытыцы. Сапраўды: не адно пакаленне утапістаў марыла пра такі грамадскі лад, калі стасункі паміж людзьмі (унутры супольнасцяў і звонку) не будуць апасродкаваны дзяржавай як палітычным інстытутам. Але ўсе спробы рэалізаваць такі ідэал альбо ажыццяўляліся на невялікіх тэрыторыях (кібуцы, камуны), альбо прыводзілі да адваротных жадаемым вынікаў – да паглыблення аўтарытарных тэндэнцыяў ці нават да ўсталявання замест царства свабоды, роўнасці і братэрства жорсткіх дыктатур і дэспатый (камуністычныя рэжымы XX ст. і  да т. п.). Ды і сам Д. Андрэеў, стаўшы ахвярай сталінскага рэжыму, гэта цудоўна разумеў: «у адзінай агульначалавечай дзяржаве прадчуваецца пастка, адкуль адзінае выйсце будзе да абсалютнага адзінаўладдзя, да царства “князя свету гэтага”» [1, с. 9].

Трэба прызнаць, што выйсця з гэтай супярэчнасці Д. Андрэеў гэтак і не знайшоў. Менавіта таму ягоная «Ружа свету» уяўляе сабой парадаксальнае спалучэнне крайняй утопіі з крайняй антыутопіяй. З аднаго боку, мы бачым  наіўныя мары пра агульначалавечае братэрства, пра ператварэнне планеты ў сад (ён быў адным з прадвеснікаў экалагічнага руху), пра этычны кантроль над палітычнай дзейнасцю, пра росквіт культур і рэлігій у раўнапраўным суквецці. З іншага, непараўнальныя ў сваіх змрочных фарбах апакаліптычныя прароцтвы пра ядзерную вайну ці пра прышэсце і ўладаранне антыхрыста, які ўсталюе нечуваную ў гісторыі абсалютную ўсепланетарную тыранію, да якой толькі набліжаліся яго папярэднікі – ад рымскіх імператараў да Сталіна і Гітлера.

Але лёгка лавіць прарока на памылках і правідца на супярэчнасцях. Куды важней і карысней убачыць у ягонай парадаксальнай утопіі-антыутопіі тую макісмальна шырокую рамку, якая задае два супрацьлеглыя вектары развіцця, нагадваючы як асобам, гэтак і супольнасцям  пра неабходнасць выбару паміж імі і аб тым, што кожны такі выбар у канчатковым вымярэнні спрыяе альбо боскім, альбо дэманічным сілам. Менавіта ў бесперапынным напаміне пра гэта і заключаецца галоўная каштоўнасць творчай спадчыны Данііла Андрэева.

*Літаратура*

1. Андреев Д. Роза мира. Метафилософия истории. М. – Прометей, 1991. – 288 с.